



# ДЗЕ МЁД, ТАМ І СВЯТА!








*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Храм гэты (хоць будынак афіцыйна і называюць капліцай) узведзены ў садаводчым таварыстве «Крап» у Смалявіцкім раёне і належыць грамадскаму аб'яднанню «Мінская гарадская казацкая акруга». Капліца названа ў гонар аднаго са святых альбо праведнікаў — Прападобнамучаніка Вадзіма Пярсіцкага. Дзесяць гадоў таму, калі закладвалі падмурак, першы беларускі мітрапаліт Філарэт вызначыў імя святога патрона казацкай святыні.

— Капліцу будавалі талакой, сваімі рукамі казакі ўзводзілі сцены, крылі дах, вешалі званы на званіцу, масцілі дарогу і прыступкі, — падзяліўся прыемнымі ўспамінамі **казачы атаман Генадзь ЖУМЯНОК.** — Мядовы Спас склікаў нашу суполку, лічы, казацкі прыход, каб у царкоўнай атмасферы адзначыць першы юбілей капліцы і дваццаціпяцігоддзе ўтварэння Мінскай казацкай акругі.

На святочнае богаслужэнне прыйшлі і іншыя дачнікі. Службай правіў протаіерэй Андрэй Еўдакімаў — настаяцель храма архангела Міхаіла ў горадзе Жодзіна, кіраўнік Барысаўскага епархіяльнага аддзялення па сувязях з казацтвам. Святар акрапіў мёд, які сабраў на сваёй пасецы і раздаваў усім прысутным казак-пчаляр Валерый Жураўскі. Атаман уручаў памятныя юбілейныя медалі актыўным казакам, сярод якіх быў Вацлаў Селіцкі — арганізатар і куратар будоўлі капліцы, цяперашні яе захавальнік, а таксама казачка Ірына Захаранка.

Свята прайшло пад ігру навенькіх званоў умелага званара — харунжага Віктара Церахава.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

*Больш здымкаў з гэтай падзеі глядзіце на сайце «Звязды».*